Совокупность всех учебных и учебно-методических материалов, входящих в УМК по соответствующей дисциплине, составляет документацию УМК и является интеллектуальной собственностью разработчика.

УМК разрабатывается преподавателем или коллективом преподавателей кафедры, обеспечивающих чтение дисциплины. Кафедра является ответственной за качественную разработку УМК в соответствии с требованиями Государственного стандарта.

Учебно-методические материалы, включаемые в УМК, должны отражать современный уровень развития науки, предусматривать логически последовательное изложение учебного материала, использование современных методов и средств интенсификации учебного процесса, позволяющих студентам глубоко осваивать учебный материал и получать навыки по его применению на практике [3].

Разработка УМК включает следующие этапы [3]:

- разработка учебной программы по дисциплине;
- разработка модели УМК;
- разработка конспекта лекций, методики проведения лабораторных занятий, наглядных материалов, заданий для студентов и т.д.;
- оформление документации по УМК;
- апробация материалов УМК в учебном процессе;
- корректировка материалов УМК.

Следовательно, разработка и использование УМК направлены на овладение студентами определенной суммы знаний, на их самостоятельное приобретение, на работу с учебной информацией и сознательное применение их в последующей профессиональной деятельности.

Литература


1. Алтайцев, А.М. Учебно-методический комплекс и самостоятельная работа студентов /А.М. Алтайцев/ Аналитический обзор международных тенденций развития высшего образования. – №5. – 2003.
2. Жку, А.И. Учебно-методические комплексы /А.И. Жук, А.В. Макаров/ Методическое пособие. – Мн. – БГУ, 2001.
3. Ступина, Е.Е. Общие принципы разработки учебно-методических комплексов на примере УМКД «Маркетинг» /Е.Е. Ступина, А.А. Ступин/ 2008.


## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СТУДЭНТАЎ У СІСТЭМЕ МЕНЕДЖМЕНТА ЯКАСЦІ ВНУ


***С.В. Мартынкевіч***

***УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, Віцебск***


Працэс глабальных змен у адукацыйнай прасторы сучаснага грамадства прадугледжвае актыўны пошук і распрацоўку шляхоў навучання, якія садзейнічалі б прафесійнаму станаўленню асобы. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця патрабуюць ад маладых людзей не толькі трывалага засваення сістэмы спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў, але і развіцця здольнасцей, асобасных якасцей, авалодання універсальнымі спосабамі дзейнасці, якія паспрыяюць сацыялізацыі і хуткай прафесійнай адаптацыі.

Репозиторий ВГУ

На вырашэнне названых задач накіраваны кампетэнтнасны падыход да арганізацыі адукацыйнага працэсу, які прадугледжвае фарміраванне вядучых кампетэнцый асобы – тых ведаў, уменняў і навыкаў, што з'яўляюцца прафесійна значнымі для студэнтаў.

Мэта артыкула – разгледзіць складнікі прафесійнай каметэнцыі студэнтаў-філолагаў, вылучыць асноўныя веды, уменні і навыкі, неабходныя для станаўлення і якаснай самарэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці.

Фарміраванне прафесійнай кампетэнцыі спецыялістаў-філолагаў прадвызначае дасканалае валоданне лінгвістычнымі ведамі пра мову як сістэму і грамадскую з'яву, будову і функцыянаванне моўных адзінак у кантэксце, аперыраванне звесткамі пра гісторыю роднай мовы і сучасны стан беларускага мовазнаўства. Практыка- арыентаваная падрыхтоўка будучых спецыялістаў накіравана на развіццё аналітыка-сінтэтычных уменняў і навыкаў, дзякуючы якім адбываецца дасканалае авалоданне моўнымі рэсурсамі ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Фарміраванне моўнай асобы студэнта з'яўляецца стратэгічнай мэтай гуманітарнай адукацыі, таму лінгвістычная кампетэнцыя – адзін з вызначальных складнікаў прафесійнай кампетэнцыі.

Цікавасць да кумулятыўнай функцыі мовы на сучасным этапе арыентуе філалагічную адукацыю на фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі студэнтаў, што спрыяе ўсведамленню этнічнай функцыі беларускай мовы, яе ролі для выражэння нацыянальнай самабытасці, пазнанню беларускай культуры ў дыялогу і ва ўзаемадзеянні з культурамі іншых народаў. Асэнсоўваючы беларускую мову як сродак засваення культурных каштоўнасцей, адбываецца фарміраванне моўнай карціны свету, а разам з гэтым адной з важнейшых каштоўнасных арыентацый асобы – уразуменне значнасці роднай мовы ў жыцці народа і для кожнага чалавека. У выніку адбываецца фарміраванне лінгвакультуразнаўчай кампетэнцыі, што дае студэнтам магчымасць свабодна аперыраваць такой інфармацыяй у працэсе прафесійнай камунікацыі.

Варта адзначыць, што ў сучасных сацыякультурных умовах прагматычны ўзровень моўнай асобы вызначаецца ў якасці дамінуючага, у сувязі з чым камунікатыўнае развіццё становіцца прыярытэтнай задачай у сістэме адукацыі. Гэта падпарадкоўвае працэс навучання асноўнай мэце – фарміраванню камунікатыўна-кампетэнтнай асобы, якая дасканала валодае мовай і можа рэалізаваць свой маўленчы патэнцыял у розных сферах суразмоўніцтва ў адпаведнасці з сацыяльна прынятымі правіламі.

Камунікатыўная кампетэнцыя – аснова прафесіяналізму філолага. Улічваючы, што адным з накірункаў працы з'яўляецца педагагічная дзейнасць, неабходна мець на ўвазе, што камунікатыўная кампетэнцыя настаўніка – гэта "…здольнасць весці моўныя зносіны ў тыповых сітуацыях практычнай прафесійнай дзейнасці, а таксама кіраваць працэсам камунікацыі і фарміраваць камунікатыўную кампетэнцыю вучняў" [1, 8]. Таму патрабаванні да ўзроўню камунікатыўных ведаў, уменняў і навыкаў сучасных студэнтаў павінны быць асабліва высокімі.

Адаптацыі студэнтаў у час практычнай педагагічнай дзейнасці будуць садзейнічаць такія ўменні, як уменне будаваць зносіны ў залежнасці ад спосабу камунікацыі (кантактны / дыстантны, вусны / пісьмовы); весці дзелавое суразмоўніцтва; кіраваць і задаць тон (танальнасць) маўленню ў час узаемін; кантраляваць учынкі ў працэсе камунікацыіі. Авалоданне ўсімі

Репозиторий ВГУ

відамі маўленчай дзейнасці, нормамі камунікатыўнай культуры дазволіць арганізаваць эфектыўнае суразмоўніцтва, дасягнуць пастаўленай мэты ў пэўнай сітуацыі маўлення. Веданне стратэгій і тактык, захаванне правіл камунікатыўных паводзін будзе садзейнічаць якаснай самарэалізацыі ў дынамічных вытворчых умовах.

Сучасныя тэхналогіі паступова прыводзяць да таго, што "чалавек у выніку інфармацыйна-інтэлектуальнага развіцця становіцца новым тыпам думаючага чалавека – чалавекам інфармацыйным – Homo informaticus" [2, 34]. Каб прадуктыўна працаваць з інфармацыяй, прысвойваць асобасна значымую і адмяжоўваць другарадную, на занятках лінгвістычнага цыклу неабходна фарміраваць спецыяльныя інфармацыйныя ўменні: аналізаваць, структураваць, перапрацоўваць і перадаваць інфармацыю ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай; вызначаць сістэму аргументаў; фармуляваць уласную пазіцыю да ўспрынятай інфармацыі. Яны запатрабаваныя ў час вуснай і пісьмовай камунікацыі, у працэсе працы з электроннымі і папяровымі носьбітамі і з'яўляюцца неабходным складнікам камунікатыўнай кампетэнцыі асобы.

Асаблівае значэнне ў станаўленні будучага спецыяліста мае метадычная кампетэнцыя, якая фарміруецца пры вывучэнні практыка-арыентаваных педагагічных дысцыплін. Галоўнае месца сярод іх займаюць методыкі выкладання мовы і літаратуры, засваенне якіх накіравана на развіццё спецыяльных уменняў і навыкаў, што запатрабаваныя для арганізацыі працэсу моўнай адукацыі вучняў агульнаадукацыйных устаноў розных тыпаў.

Фарміраванню метадычнай кампетэнцыі студэнтаў спрыяюць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі – гульнявыя (дзелавая гульня), праектныя (распрацоўка творчых лінгвадыдактычных праектаў), педагагічныя майстэрні і інш. Штучныя педагагічныя сітуацыі, арганізаваныя на занятках, дазваляюць студэнтам змадэляваць свае паводзіны, актуалізаваць неабходныя метадычныя веды. Пры гэтым адбываецца фарміраванне арганізацыйных, гнастычных, прадуктыўных, праекцыйных уменняў, якія неабходныя для вырашэння задач навучання ў час вытворчай практыкі і ў самастойнай прафесійнай дзейнасці.

Безумоўна, станаўленне будучага спецыяліста немагчыма без удасканалення базавых кампетэнцый, якія ўключаюць каштоўнасныя арыенціры, агульнакультурныя веды і сацыяльна-арыентаваныя ўменні і навыкі.

Такім чынам, сучаснае грамадства партабуе высокага ўзроўню адукацыі і якаснай падрыхтоўкі выпускніка ВНУ. Лінгвістычная, лінгвакультуралагічная, камунікатыўная і метадычная кампетэнцыі ўтвараюць прафесійную кампетэнцыю студэнта-філолага, якая з'яўляецца інтэгральнай характарыстыкай асобы. Кампетэнтнасны падыход вызначае, што веды, уменні і навыкі як зместавыя складнікі маюць практычную накіраванасць і забяспечваюць гатоўнасць маладога чалавека да будучай прафесіі.

Літаратура

1. Русецкий, В.Ф. Теория и практика формирования профессиональной коммуникативной компетенции учителя-филолога в педагогическом ВУЗе (на материалах лингвистических дисциплин) / В.Ф. Русецкий. – Автореф. … д-ра пед. наук. – Мн.: БГУ, 2002. – 39 с.
2. Арнольдов, А.И. Культура общения: современные коллизии / А.И. Арнольдов. – М.: Издательский Дом МГУКИ, 2005. – 93 с.

Рэпазіторый ВДУ